# ВЕРНЫ СЫН ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ

*(Да 75-годдзя з дня нараджэння В. Г. Кнорына)*

30 жніўня 1965 года спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння Вільгельма Георгіевіча Кнорына.

Сын беднага латышскага селяніна, Кнорын з дзяцінства батрачыў у кулака, а ў пятнаццаць гадоў стаў рабочым фабрыкі ў гарадку Лігатне. Тут ён сустрэў рэвалюцыю 1905 года, якая вызначыла яго далейшы жыццёвы шлях. Паражэнне рэвалюцыі, зверскія расправы карнікаў толькі ўмацавалі рэвалюцыйны настрой юнага Вільгельма. Паступіўшы ў 1906 годзе ў настаўніцкую семінарыю, ён вывучае філасофію, працы класікаў марксізма. Рана праявіліся творчыя здольнасці маладога Кнорына. Пачаўшы з вершаў, ён неўзабаве адмаўляецца ад іх, пераходзіць да журналістыкі, публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі.



У маі 1910 года В. Г. Кнорын, уступіўшы ў адну з падпольных арганізацый сацыял-дэмакратычнай партыі Латвіі, далучыўся да яе бальшавіцкага крыла. З таго часу на ўсё жыццё ён звязаў сябе з партыяй Леніна. Працуючы настаўнікам спачатку ў правінцыі, а затым у Рызе, Кнорын вёў рэвалюцыйную прапаганду.

Заходнім фронце, ва ўсёй Беларусі. Зрыў брэсцкіх перагавораў абарваў кіпучую дзейнасць Савецкай улады ў Беларусі. Нямецкія войскі пачалі акупацыю Беларусі. Кнорын як старшыня Мінскага гаркома партыі рыхтуе кадры для партыйнага падполля.

Вялікая была роля Кнорына ў стварэнні, па ўказанню У. І. Леніна, у канцы 1918 — пачатку 1919 гадоў Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі. У цяжкіх умовах грамадзянскай вайны і барацьбы супраць інтэрвентаў Кнорын вядзе велізарную партыйна-арганізацыйную і прапагандысцкую работу. Пасля вызвалення Мінска і Беларусі ад белапольскай акупацыі Кнорын узначаліў партыйную арганізацыйную тройку, затым Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, створаны Рэўваенсаветам Заходняга фронту. У працэсе аднаўлення БССР Кнорын вядзе барацьбу на два фронты — супраць вялікадзяржаўнага шавінізму і супраць мясцовага буржуазнага нацыяналізму. Гэта адлюстравана ў «Дэкларацыі аб незалежнасці сацыялістычнай савецкай рэспублікі Беларусі», якую Кнорын падпісаў ад імя партыі.

Партыйны кіраўнік ленінскага тыпу, арганізатар, агітатар, прапагандыст, Кнорын разам з тым быў простым, сціплым і душэўным таварышам, карыстаўся ў працоўных Беларусі велізарным аўтарытэтам і любоўю.

З мая 1922 года В. Кнорын працаваў у Маскве ў ЦК РКП(б). У 1925 годзе на XIII Маскоўскай партканферэнцыі ён быў выбраны членам МК РКП(б), членам бюро МК, загадваў агітпрападдзелам МК. У 1926—27 гадах Кнорын — загадчык агітпропа ЦК ВКП(б). У 1927—1928 гадах ён — сакратар ЦК КП(б) Беларусі. Кнорын быў дэлегатам VIII—XVII з'ездаў партыі, неаднаразова выбіраўся ў члены ЦК ВКП(б).

В. Г. Кнорын быў дэлегатам V, VI і VII кангрэсаў Камінтэрна. На VI кангрэсе ён быў выбраны членам Выканкома Камінтэрна. З 1928 года па 1931 год Кнорын працаваў за мяжой як прадстаўнік Камінтэрна, а з 1931 па 1935 год — у Маскве як член Выканкома Камінтэрна і загадчык Сярэднееўрапейскага сакратарыята.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы